XVII ст., амаль усе польскія, літоўска-беларускія хронікі, дыярыушы; бібліяграфічныя даведнікі, энцыклапедыі, атласы, вопісы архіваў і інш.

Рупліва сабраныя і захаваныя А.Ельскім матэрыялы былі патрэбны гісторыкам, этнографам, пісьменнікам, фалькларыстам, краязнаўцам многіх краін свету. Пра гэта сведчыць тое, што ў кнізе наведвальнікаў музея ёсць запісы на рускай, французскай, нямецкай, дацкай і, зразумела, беларускай мовах.

Асабліва шчодра выкарыстоўваў матэрыялы музея сам А.Ельскі. На аснове іх ён напісаў звыш дзесяці тысяч гісторыка-краязнаўчых артыкулаў пра Беларусь.

Падзвіжніцкая культурная праца Аляксандра Ельскага мела шырокі рэзананс у славянскім свеце. Яго імя заўсёды з пашанай згадвалася ў грамадска-культурных колах.

У заключэнне заўважым, што вывучэнне і засваенне гісторыка-культурнай спадчыны з'яўляюцца спрыяльнай глебай для выхавання моладзі.

**Лазарава С.М.,**
*суіскальнік кафедры*
*сацыялогіі і культуразнаўства*

## ЗНАЧЭННЕ СПАДЧЫНЫ КІРЫЛЫ ТУРАЎСКАГА Ў АДРАДЖЭННІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

Даследаванні культуры, літаратуры мінулага маюць не толькі тэарэтычнае, але і практычнае значэнне. Яны садзейнічаюць больш глыбокаму асэнсаванню заканамернасцей, вызначэнню перспектыў развіцця культуры і літаратуры сучаснасці і будучыні.

Але да нашага часу беларуская культура як цэласная сістэма, комплекс духоўных, матэрыяльных каштоў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насцей, што склаліся гістарычна, грунтоўна яшчэ не даследавана. Так, вельмі павярхоўна была распрацавана даследчыкамі гісторыя асветы, грамадскай і філасофскай думкі Беларусі. Вывучэнне рэлігіі, напрыклад, раней зусім выключалася са зместу культуры. Важным і даўно наспелым у вывучэнні беларускай культуры ў сучасны перыяд з'яўляецца пытанне яе нацыянальнай самастойнасці, узроўню развіцця апошняй на розных этапах нашай гісторыі.

На нашу думку, у цяперашніх умовах чарговага адраджэння беларускай культуры вельмі актуальным будзе даследаванне духоўна-культурнай спадчыны Кірылы Тураўскага. Справа ў тым, што літаратурная спадчына і дзейнасць К.Тураўскага да гэтага часу не атрымалі належнай усебаковай навуковай ацэнкі. У дарэвалюцыйных працах вучоных ён паўставаў галоўным чынам як царкоўны дзеяч. Яго духоўную спадчыну разглядалі, тлумачылі з пункту гледжання рэлігійнага зместу. Больш шырокіх метадалагічных пазіцый прытрымліваюцца даследчыкі сённяшняга часу: Ю.Лабынцаў, А.Кляўчэня, А.Мельнікаў, А.Лойка, якія знаходзяць у творчасці К.Тураўскага філасофскія і грамадскія думкі, што патрабуюць далейшых асэнсавання, распрацоўкі.

Кірыла Тураўскі — буйнейшы рэлігійны дзеяч XII ст., выдатны паэт, асветнік, майстра прыгожага пісьменства. На жаль, пакуль мы мала ведаем пра яго жыццё і дзейнасць. Невядомы дакладна нават даты нараджэння і смерці асветніка, месца яго пахавання, свецкае яго імя. Да нас дайшла адзіная крыніца, у якой ёсць звесткі пра жыццё і дзейнасць гэтага чалавека,— "Жыціе Кірылы Тураўскага". Там паведамляецца, што ён нарадзіўся і ўзгадаваўся ў г. Тураве. Спачатку ў бацькоўскім доме, потым у мясцовым манастыры будучы пісьменнік атрымаў добрую адукацыю. Ёсць усе падставы для таго, каб лічыць, што ён вучыўся і ў Кіеве. З "Жыція" мы даведваемся пра матывы манаскага шляху Кірылы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тураўскага: "Сын заможных бацькоў, ён не любіў, аднак жа, багацця і тленнай славы гэтага свету; але найперш стараўся спасцігнуць вучэнне Боскіх кніг і добра напрактыкаваўся ў святых пісаннях".

Нарадзіўшыся паэтам, Кірыла пайшоў у манахі, адмовіўся ад свецкіх радасцей жыцця дзеля ідэі духоўнага ўзвышэння. Імкнучыся да яшчэ большага подзвігу, ён зачыніўся ў стаўпе і, знаходзячыся ў адзіноце і малітвах, напісаў многа твораў. Гэта была першая зямная слава манаха-кніжніка, якая дазволіла яму стаць епіскапам "града Турава". Узведзены ў сан Кірыла ўмела кіруе епархіяй, клапоціцца аб царкоўным добраўпарадкаванні, будуе царкоўныя храмы ў сваім родным горадзе, наглядае за гарадскімі манастырамі, але асноўны сэнс дзейнасці бачыць у славесным служэнні свайму народу, выратаванні людскіх душ.

Кірыла Тураўскі пакінуў нашчадкам значную, разнастайную па форме ідэйную спадчыну. Да яе адносяць словы, што прамаўляліся падчас свят, прытчы, пасланні, малітвы, павучэнні, каноны і іншыя творы. Магчыма, ён склаў пропаведзі літаральна да ўсіх гадавых свят хрысціянскага календара.

Царкоўна-літаратурная творчасць Кірылы хаця дайшла да нас у значным аб'ёме, аднак выключна ў пазнейшых спісах (найчасцей XVI—XVIII стст.). Цяпер вядома больш за 60 твораў, якія належаць або прыпісваюцца пяру святога Кірылы Тураўскага.

Кірылу Тураўскаму адводзяць значную ролю ў засваенні дасягненняў грэчаскай культуры на падставе вывучэння айчыннай думкі. Таму ў яго творчасці прасочваем уплыў візантыйскай культуры, што за тысячу гадоў існавання дакраналася да ўсіх культур свайго часу — славянскай, грузінскай, арабскай, персідскай, аказвала ўплыў на іх развіццё, была прасякнута царкоўнай ідэалогіяй. У культуры славянскіх народаў такі ўплыў праявіўся асабліва моцна, плённа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пропаведзі епіскапа Кірылы паказваюць таксама, што ён быў грунтоўна знаёмы з візантыйскай літаратурай, валодаў грэчаскай мовай. Але ён не толькі сур'ёзна засвоіў урачыстае красамоўства сваіх папярэднікаў, візантыйскіх прапаведнікаў, але і развіваў яго далей у дачыненні да канкрэтна-гістарычных умоў Кіеўскай Русі. Алесь Дуброўскі, напрыклад, вызначае наступныя тыпы выкарыстання Кірылам Тураўскім біблейскага тэксту:

— цытаванне Бібліі,

— пераасэнсаванне біблейскага тэксту,

— стварэнне на падставе біблейскіх ідэй, вобразаў або эпізодаў уласнага кантэксту.

Рускія людзі называлі Кірылу Тураўскага "Златоуст, паче всех воссиявший нам на Руси". Ён лічыцца адным са стваральнікаў духоўных асноў рускага праваслаўя нароўні са святымі мітрапалітам Іларыёнам і Феадосіем Пячэрскім. У напісаных ім малітвах з найбольшай для славянскіх літаратур мастацкай сілай перададзены ўсведамленне маральнай недасканаласці чалавека, пачуццё віны за яе перад Богам: "...Ты привел меня из небытия в бытие и украсил подобием Своего образа, одарив меня словом и разумом, Ты вознес меня превыше животных и поставил владыкою всей твари... желая включить меня в лик прекрасных твоих ангелов, Ты дал мне заповедь и повелел мне в чистоте совершать духовный подвиг, а я, окаянный, совращен был своим умом в своеволие, по любви к плотскому бросился в смрадную тину греховную и удалился от Твоей благодати. Я был Твой сын по возрождении в духовной купели, а после я — раб греха. Поэтому я стенаю из глубины сердечной и плачу в глубине души моей... Где скрою я множество моих беззаконий? ... Пригвозди плоть мою страхом Твоим, да не окажуся обнаженным от добрых дел, не посмеются надо мною демоны..."

Для твораў Кірылы Тураўскага характэрна і цэласнае разуменне чалавека. Ён не супрацьпастаўляе душу і цела,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яны існуюць у адзінстве, раздзяляюцца толькі ў выніку граху. Умова цэласнасці чалавека, лічыць Кірыла,— выкананне ім Божых загадаў. Кіруючую ролю ў чалавечай дзейнасці павінен выконваць розум (Кірыла параўноўвае яго з царом дзяржавы). Але кіраваць ён можа тады, калі сам падпарадкоўваецца вызначаным аб'ектыўным ісцінам, інакш страчвае сябе. Разумны пачатак дазваляе бачыць сапраўдную глыбіню свету, ён павінен вызначаць духоўную дзейнасць чалавека: "Сладко бо медвеный сот и добро сахар, обоего же добрее книгий разум: сия убо суть сокровища вечныя жизни".

Пазнанне — стымул духоўна-маральнага пакаяння, ачышчэння, што "претворяются в добродетель", а значыць, у стымул удасканалення чалавека. Духоўная прырода павінна дамінаваць. Не ад цела, ад душы залежыць удасканаленне чалавечай асобы: "Тем же тело без души хромо есть и не наречеться человек, но труп".

Кірыла выказвае думку пра неабходнасць узаемасувязі розуму і дабрачыннасці. Розум павінен накіроўваць у бок добрых учынкаў, дабрачынным можна быць з дапамогай толькі розуму.

Светапогляду Кірылы ўласцівыя жыццесцвярджальныя, аптымістычныя рысы. Ён ставіць мэтай не толькі асабістае ўнутранае ўдасканаленне, але і ўздзеянне на іншых людзей дзеля ўдасканалення іх. Чалавек, які дасягнуў унутранай свабоды, павінен адначасова набыць здольнасць дзейнічаць у якасці больш узвышанай, маральна чыстай сілы ў асяроддзі сабе падобных. Унутрана свабодны чалавек такой дзейнасцю ўносіць сваю долю ў здзяйсненне маральнага ідэалу. Адным з вынікаў падобнага светаўспрымання Кірылы Тураўскага з'яўляецца змаганне за праўду: "Отверзи мне врата правды..." Істотнымі з'яўляюцца іншыя ідэі: "Богатьство, иже мимо течет,— не прилагайте сердца",— вучыць ён. "Нищелюбие", паводле яго слоў,— адна з пералічаных дабрачыннасцей, неабходны шлях да ўратавання чалавека. Аб "спасени крестиан", "спасени душь наших писаных" не раз гаворыць Кірыла.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У "Слове на антипасху" Кірыла Тураўскі гаворыць пра вясну і Хрыста: "Ныне солнце, красуясь на высоте, восходит и радостно землю согревает; поелику Христос, солнце праведное, воссиял от гроба и спас всех верующих в Него. Ныне луна, сошедши с высшей степени, большему светилу честь воздает; так — Ветхий завет со своими субботами, согласно Писанию, прекратился, и церковь чтит закон Христов и день недельный... Ныне красуется весна, оживляя земную природу..." У гэтай пропаведзі — радасць ад абуджэння прыроды і ўваскрасення Хрыста, захапленне словам, якое дазваляе гэтыя з'явы, радасць перадаць. Кірыла Тураўскі стварае карціну радасці самой прыроды, сведчыць аб адухоўленасці яе і ўсюдыіснасці Бога. Слова мае для яго біблійнае значэнне: "Слова — Бог". Слова адкрывае чалавеку таямнічы свет, зямны і нябесны. Гэтая глыбокая пашана да слова надае словам у творах свяціцеля першародную сілу ўздзеяння на асобу.

Трэба адзначыць, што дзейнасць Кірылы Тураўскага прыпала на той перыяд, калі на Русі пачаліся міжусобныя сутыкненні, войны. Свяціцель адчуваў: міжусобіцы нясуць смерць, разбурэнні, аслабляюць народ. Таму ён як мог змагаўся супраць насілля, абараняў дабрачыннасць і рабіў гэта праз свае словы, прытчы, пасланні, павучэнні.

Не стаяў ён убаку і ад тагачаснай вострай палітычнай барацьбы перыяду раздробленасці. Яркае сведчанне таму — яго ўдзел у справе Феадорца. Сутнасць справы ў тым, што растоўскі епіскап Феадорац задумаў пры падтрымцы князя Андрэя Багалюбскага стварыць у княстве аўтакефалію, а фактычна — раскалоць праваслаўную царкву. Напэўна, яго рукамі сам князь хацеў атрымаць незалежнасць ад Кіева, ад сваёй мітраполіі.

Але такая спроба самазванца-мітрапаліта выклікала рэзкае асуджэнне князёў, духоўных асоб Старажытнай Русі. Рашуча выказаўся тады і Кірыла. З гэтай нагоды была напісана "Кирила мниха притча о человечьстей души и о

телеси, и о будущемъ суде, и о муце" (прытча гэтая мае другую назву — "Аповесць аб сляпцы і храмцы"). Епіскап Кірыла не толькі ерась Феадорца выкрываў, але і Андрэю Багалюбскаму напісаў шмат пасланняў. Яны, на жаль, не захаваліся. Гая гісторыя скончылася так: князь выракся Феадорца, той быў жорстка пакараны.

Усё гэта сведчыць пра тое, што К.Тураўскі быў аддаены ідэі незалежнасці роднага княства і ідэі адзінства, што зыходзіла са стольнага Кіева.

Аўтар навуковых прац, прысвечаных К.Тураўскаму, Аляксей Мельнікаў адзначаў: Кірыла Тураўскі зрабіў надзвычай многа для беларускага народа. Па-першае — як дыпламат у Кіеве, Суздалі. Па-другое — як настаўнік, перакладчык Бібліі, прапагандыст хрысціянскай веры. Па-трэцяе — як храмабудаўнік. Па-чацвёртае — як літаратар. Асветнік напісаў велізарную па тым часе колькасць твораў. Толькі дэталёвае вывучэнне іх усіх дасць канчатковае ўяўленне пра асобу К.Тураўскага, яго светапогляд і маштаб яго літаратурнага таленту. Высветліць гэта — значыць высветліць ролю святіцеля ў гісторыі сваёй эпохі, свайго народа, славянскага свету ў цэлым. Пакуль яна застаецца недаацэненай.

Такім чынам, вывучэнне рэлігійна-асветніцкай і літаратурнай дзейнасці Кірылы Тураўскага красамоўна паказвае, што культура беларускага народа ўжо тады выяўляла сваю арыгінальнасць, самабытнасць.

**Густава Л.А.,**
*суіскальнік кафедры*
*харавога мастацтва*

## ДУХОЎНАЯ МУЗЫКА Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСІ

Рэлігійная музыка — той скарб, які доўгія дзесяцігоддзі быў схаваны ад нас. Гэтая музыка ачышчае душу чалавека, дапамагае пераадолець жыццёвыя цяжкасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ